де в окольный город; криничку со «святой водой» у подножья Окольного города; фрагмент пристани на р. Друть; музей истории Друцка (в помещении бывшей конюшни XIX в.); дом князя на детинце и дом боярина в окольном городе; обозначение отдельных участков раскопок стендами с соответствующей информацией.

На более отдаленную перспективу планируется также: реставрация и реконструкция 2-х этажной каменной мельницы 19 в. у въезда в агрогородок Друцк (придорожная гостиница и ресторан); реставрация каплицы и помещичьих построек 19 в. с прудом и парком в д. Кривая в 0,5 км от Друцка.

Цели и задачи туристического комплекса: ознакомление с историей Друцка и Друцкого княжества, развитие культурного и краеведческого туризма, популяризация археологических памятников и истории края, возрождение средневекового быта и ремесел для их использования в современных условиях (массовые мероприятия).

Предпосылки для создания комплекса:

- единственное место в Беларуси, где сохраняются и не застроены все участки города раннего средневековья (детинец, окольный город, посад и курганные могильники);

- наличие научной базы (зал древней истории Толочинского историко-краеведческого музея, материалы археологических исследований Друцка);

- хорошие транспортные отношения (дорога Толочин – Круглое – Могилев в 2 км от Друцка, Москва – Минск в 12 км от Друцка);

- наличие социальной базы (агрогородок Друцк).

1. Алексеев Л.В. Древний Друцк (письменные источники, топография, время возникновения). К празднованию тысячелетия Друцка. 1001-1001 гг. // Российская археология. – 2002. – № 1. – С. 74 – 91.
2. Левко О.Н. Древний Друцк. Начальные этапы истории. // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 25. – Мн. – 2010. – С. 261-267.
3. Левко О.Н., Войтехович А.В., Кенько П.М. Археологические исследования Друцка в 2008 – 2009 гг.// Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка) /Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 21. – Мн.– 2011. – С.122 – 153.

**Ткачоў А.Ю.**

## З ВОПЫТУ ВЫВУЧЭННЯ І ЗАХАВАННЯ АРХЕАЛАГІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАРКУ “БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА”

Мінск, Рэспубліка Беларусь

Нацыянальны парк “Белавежская пушча” з’яўляецца унікальным прыродна-ландшафтным комплексам і адным з буйнейшых турыстычных цэнтраў Беларусі, які штогод прымае больш



Репозиторий ВГУ

за 180 тыс. наведвальнікаў, якіх вабяць Музей прыроды, вальеры з дзікімі жывёламі, экскурсіі па пушчы, сядзіба беларускага Дзеда Мароза [1, с. 11]. У 1991 г. Белавежская пушча атрымала статус Нацыянальнага парку, ў 1993 г. – статус “біясфернага запаведніка”. У 1992 г. ЮНЭСКА ўключыла пушчу ў Спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва.

Між тым Белавежская пушча – не толькі помнік прыроды, гэта яшчэ буйнейшы помнік гісторыі. Пачынаючы з часоў фінальнага палеаліту, калі ўпершыню на гэтай тэрыторыі з’явіўся чалавек, пачалося накапленне культурнай спадчыны. Спадчыны, якая дае ўяўленні пра гістарычныя працэсы, што адбываліся ў гэтым рэгіёне на працягу 12 тыс. год.

Нягледзячы на тое, што першыя археалагічныя працы на тэрыторыі пушчы былі праведзены яшчэ ў канцы XIX ст., па розных прычынах (блізасць дзяржаўнай мяжы, невялікая колькасць археолагаў у краіне) тэрыторыя Нацыянальнага парку доўгі час заставалася па-за ўвагай даследчыкаў і заставалася “белай плямай” на археалагічнай карце Беларусі. Сітуацыя карэнным чынам пачала змяняцца ў канцы XX – пачатку XXI ст., калі сваі даследаванні ў рэгіёне пачалі праводзіць В. Белявец, В. Вяргей, А. Калечыц, А. Квяткоўская, М. Крывальцэвіч, В. Лакіза, В. Сідаровіч, А. Ткачоў. З 2007 г., у сувязі з падрыхтоўкай да 600-годдзя ўсталявання запаведнасці, пачалося мэтанакіраванае і шырокамасштабнае вывучэнне помнікаў археалогіі на тэрыторыі Нацыянальнага парку “Белавежская пушча” [2-5].

За апошнія гады ў рамках выканання комплекснай праграмы па вывучэнню помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Белавежскай Пушчы адкрыта звыш 50 першабытных помнікаў, якія ўтрымліваюць матэрыялы каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.

Доўгі час сярод навукоўцаў панавала думка, што ўсталяванне запаведнага рэжыму і абмежаванне гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі Белавежскай пушчы садзейнічае захаванню помнікаў археалогіі [6 с. 14]. Нажаль, як паказала практыка, сітуацыя цалкам супрацьлеглая. У выніку ўвядзення абмежаванняў, мясцоваму насельніцтву прыйшлося найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваць тыя рэсурсы, што былі па-за межамі запаведнасці (вольныя ад лесу дзюны і тэрасы), дзе месціліся старажытныя стаянкі і паселішчы. Таму значная частка з даследаваных помнікаў у ваколіцах пушчы пашкоджана антрапагенным уздзеяннем (воркай, буртавымі ямамі і г.д.). Частка з іх працягвае руйнавацца і зараз. Вось чаму так востра стаіць пытанне аб захаванні археалагічнай спадчыны Белавежскай пушчы. У дадзеным артыкулу мы засяродзім увагу толькі на адным прыкладзе – правядзенні выратавальных археалагічных раскопак на

Рэпазіторый ВГУ

помніку, якія трапіў ў зону будаўніцтва абвадной аўтадарогі вакол Белавежскай пушчы.

Археалагічныя даследаванні ў зоне будучай дарогі пачаліся ў самым пачатку чэрвеня 2010 г. і працягваліся да канца года. Аднак пасля першапачатковага этапу абследавання, стала зразумела, што раннім летам з-за моцнай задзірваванасці зоны будаўніцтва і ўзбярэжжаў рэк, засаджанасці палёў сельскагаспадарчымі культурамі, правесці суцэльнае абследаванне і выявіць аб’екты археалогіі будзе складана. Тым больш, на гэты момант траса аўтадарогі не была пазначана на мясцовасці, што вымушала праводзіць абследаванне ў больш шырокіх межах. У выніку, толькі на ўчастку в. Ваўкаставец – граніца Гродзенскай вобласці (Груск) было зафіксавана 16 розначасовых помнікаў археалогіі (месцазнаходжанні, стаянкі, селішчы), з якіх 14 былі выяўлены ўпершыню.

У зону будаўніцтва будучай аўтадарогі дакладна траплялі помнікі каля вёсак Стаўповіскі і Голы Барокі Камянецкага раёна. Але ўжо праз тыдзень пасля правядзення разведкі, калі планавалася праводзіць другі этап навуковых прац на аб’екце (раскопкі), высветлілася, што працы на многіх участках ужо пачаліся, і стаянкі каля в. Голы Барок знішчаны. Таму асноўная ўвага была звернута на даследаванне помнікаў каля в. Стаўповіскі. Дзе на шматкультурным паселішчы Стаўповіскі 5 былі праведзены буйнейшыя (больш за 650 кв.м.) раскопкі ў рэгіёне.

Помнік Стаўповіскі 5 размешчаны на левым беразе р. Белая ў паўночна-заходнім канцы в. Стаўповіскі. Прыкладная плошча 150х450 м. Да выпраставання рэчышча р. Белая ён інтэнсіўна падмываўся з паўднёва-ўсходняга боку. Частка песелішча занята пад прыватныя агароды. Плошча задзірнавана, у некаторых месцах (асабліва ў паўночнай частцы) маюцца пясчаныя агаленні. Помнік быў выяўлены падчас абследавання трасы будучай аўтадарогі ў 2010 г.

Для правядзення раскопак былі абраны некалькі ўчасткаў. Раскоп № 1 (5 × 20 м) быў закладзены каля паўднёва-заходняга кута вёскі, на краю тэрасы р. Белая. У далейшым ён быў пашыраны ў паўночна-заходні бок і яго агульная плошча склала 180 кв.м.

Амаль аднachасова з раскопам № 1 на тэрыторыі прыватных агародаў быў разбіты раскоп № 2 плошчай 55,5 кв.м. Сценкі раскопа арыентаваліся па баках свету.

Разборка культурнага пласта вялася лапатамі з далейшай прасейкай яго ў сітах з памерам вочка 6 мм. Пасля зняцця чарговага пласта праводзілася зачыстка ўсёй плошчы раскопа.

Пасля таго як пачаліся будаўнічыя працы і на месцы будучай аўтадарогі былі зняты дзірван і верхнія напластаванi, на плошчы 420 кв.м., якая атрымала назву раскоп № 3, праводзіля зачыстка ніжніх



Репозиторий ВГУ

культурных напластаванняў і даследаванне выяўленых аб’ектаў. Паралельна вялося абследаванне адвалаў і пляцоўкі пад будгарадок, што размяшчаўся на поўнач ад месца правядзенне раскопак.

На паселішчы была выяўлена наступная стратыграфія: добра задзірнаваная паверхня, пласт ворыва – 20-25 см па ўсёй плошчы раскопа, які падсцілаўся жоўтым пяском з невялікімі жалезістымі ўключэннямі. У цэнтральнай і, галоўным чынам, паўднёвай частках помніка пад ворывам захаваўся непашкоджаны культурны пласт (светла-карычневага колеру) магутнасцю 0,15–0,25 м, які плаўна пераходзіў у жоўты пясок з артзандамі.

Падчас археалагічных прац на паселішчы было выяўлена 20 нерухомых аб’ектаў. Сярод іх можна вылучыць 3 вогнішча. У час іх разборкі былі знойдзены апрацаваныя крамяні, фрагменты ляпной керамікі і кальцаніраваныя косткі.

Большасць з аб’ектаў былі памерам ад 1,5 да 3 м і мелі аднолькавую структуру: адна палова запоўнена белым пяском, другая – шэрым ці светла-шэрым; усё гэта атачаецца раўчуком светла-шэрага колера. Амаль ва ўсіх з іх трапляліся знаходкі, часам розначасовыя. Гэта дае падставу меркаваць, што большасць з іх узнікла ў пазнейшыя часы. Застаецца адкрытым пытанне аб паходжанні такіх аб’ектаў. Хутчэй за ўсё, яны маюць натуральнае паходжанне.

Падчас раскопак на паселішчы Стаўповіскі 5 выяўлена 4666 знаходак: 667 фрагментаў ляпной і 1447 фрагментаў ганчарнай керамікі, 2475 расчапаных крамянёў, косткі (100). Акрамя таго знойдзены запанкі бронзавыя (2), на адной з якіх захавалася інкрустацыя сінім шклом, вырабы з жалеза, пацерка, фрагмент рагавога грэбня, жужаль і інш. Стратыграфічна артэфакты не падзяляюцца. Асноўная частка знаходак траплялася на глыбіне 0,2-0,4 м.

Пераважная большасць крамянёвых знаходак – гэта прадукты першаснага расшчаплення (1062) і дэбітаж (1447). Сярод нуклеусаў (31) пераважаюць аднапляцовачныя ад пласцін, пласцін і адшчэпаў. Выкарыстоўваліся таксама двухпляцовачныя, шматпляцовачныя, аморфныя.

Сярод прылад працы і сколаў з другаснай апрацоўкай на помніку выяўлены: вастрыі (4), разцы (3), разец+праколка (1), пракрутка (1), рэжучая прылада, фр. (1), рэтушор/лушчань (1), скобель (1), скрабкі і скробач (13), трапецыі (3), наканечнікі стрэл (2), адшчэпы і пласціны з участкамі рэтушы (29).

Калі казаць пра храналогію, то ўпершыню людзі на помніку з’явіліся ў эпоху мезаліта (носьбіты яніславіцкай культуры), аб чым сведчаць знаходкі трапецый, вастрый, укладышаў, пласцін са скошаным рэтушшу краем. Потым на доўгі час жыццё на паселішчы спынілася. Верагодна гэта звязана было з кліматычнымі ўмовамі (павышэннем узроўня вады).

Рэпазіторый ВДУ

Аднаўляецца жыццё на помніку толькі ў канцы неаліту. Былі знойдзены фрагмент венчыка, упрыгожаны па зрэзу і з пасам "жамчужын" пад краем, фрагменты сценак з наколамі, якія адносяцца да апошняга (дабраборскага) этапу нёманскай культуры. Насельніцтва, якое пакінула такую кераміку, займалася паляваннем, збіральніцтвам і рыбалоўствам. Але яны маглі мець і пэўныя веды аб раслінаводстве і жывёлагадоўлі, маючы зносіны з цэнтральнаеўрапейскімі культурамі: варонкападобных кубкаў, шарападобных амфар, кола культур шнуравой керамікі, якія пранікалі на гэтыя тэрыторыі.

У далейшым жыцце на помніку працягвалася ў бронзавым веку (носьбіты культуры тшцінецкага культурнага кола). Аб гэтым сведчаць знаходкі на паселішчы фрагментаў керамікі, уласцівых для гэтага насельніцтва (патоўшчаныя венчыкі і фрагменты сценак арнаментаваныя пракрэсленымі лініямі).

Пэўную цікавасць выклікае вялікая колькасць керамікі са штрыхоўкай, якую даследчыкі адносяць да позняга перыяда бронзавага – ранняга жалезнага века. Нажаль, з-за нераспрацаванасці пытання, яшчэ цяжка казаць да якой археалагічнай культуры адносяцца гэтыя матэрыялы.

Склад і асаблівасці керамічнага комплексу жалезнага веку, сабранага на селішчы, адпавядае характарыстыкам помнікаў тыпу Сураж–Трасцяніца, шырока распаўсюджаным у Нёманска–Бужскім водападзеле. Гэты гарызонт можа датавацца ў межах апошніх стагоддзяў да н.э. – рубяжу эр. Самыя позныя знаходкі з помніку паходзяць з XVI-XVII стст.

Такім чынам, дзякуючы намаганням даследчыкаў аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, пры супрацоўніцтве з выкладчыкамі і студэнтамі Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта ім. А.С. Пушкіна, падтрымцы будаўнікоў і адміністрацыі Нацыянальнага парку ўпершыню былі здзейснены шырокамаштабныя выратавальныя археалагічныя раскопкі ў паўднёва-заходняй Беларусі і атрыманы коштоўны вопыт па захаванню археалагічнай спадчыны краіны. Грамадства і навукоўцы атрымалі ўнікальныя матэрыялы, якія ўвайшлі ў навуковы зварот, а не загінулі пад коламі бульдозераў. У перспектыве плануецца стварэнне новых археалагічных экспазіцый на базе атрыманай калекцыі, распрацоўка турыстычных маршрутаў, буклетаў, стэндаў, якія б максімальна поўна і яскрава раскрывалі гісторыю засялення і развіцця рэгіёна; садзейнічалі папулярэзацыі археалагічнай навукі і прыцягненню ўвагі да нашай гісторыка-культурнай спадчыны.

1. Бамбиза, Н.Н. Беловежская пуща: история и современность / Н.Н. Бамбиза // Белавежская пушча: вытокі запаведнасці: матэрыялы беларуска-польскай нарады "Аб



Репозиторий БГУ

устанаўленні даты ўвядзення запаведнага рэжыму на тэрыторыі Белавежскай пушчы”, 24 лістапада 2006 г. / Нацыянальны парк “Белавежская пушча”; рэд. кал.: М.М. Бамбіза [і інш.]. – Брэст, 2007. – С. 11–19.
2. Раскопкі на стаянцы Камянюкі-1 / В.Г Белявец [і інш.] // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2009. – Вып. 17. – С. 128–131.
3. Калечиц, Е.Г. Проблема первоначального заселения и история последующего освоения человеком территории Беловежской пущи на примере изучения многослойного поселения в урочище Горы (Каменюки-2) – 2007 г. / Е.Г. Калечиц // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2009. – Вып. 17. – С. 107–111.
4. Калечиц, Е.Г. Раскопки 2008 г. Поселения каменюки 2 (ур. Горы) у д. Каменюки на территории Беловежской пущи / Е.Г. Калечиц // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 20. – С. 243–248.
5. Лакіза, В.Л. Вывучэнне помнікаў каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў 2007 годзе / В.Л. Лакіза // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2009. – Вып. 17. – С. 143–150.
6. Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць / В.Г. Белявец [і інш.]; пад агул. рэд. А.А. Кавалені. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 454.

**Бубенько Т.С., Ляденко Б.В.**

## ИСТОРИЯ ИЗУЧЕНИЯ И РЕСТАВРАЦИИ БАШНИ ОЛЬГЕРДА В ВИТЕБСКЕ

Витебск, Республика Беларусь

Археологические исследования фортификации Витебска позволили изучить основные приёмы замкового строительства, применявшиеся в порубежных пунктах Великого княжества Литовского в XIV–XVI вв. Установлено, что Нижний замок города с момента возникновения был каменным. Изучению подверглись остатки прясел оборонительной стены в западной и восточной частях города, угловая башня, известная под названием «Нарожная» (в позднейших источниках «Духовский круглик») и небольшой по площади участок стены «Задунайской» проезжей башни (фортки).

Возведение каменного оборонительного пояса вокруг города началось, по-видимому, не ранее 30-х годов XIV в. и было закончено в 1351г. Понимая важное стратегические значение города, Ольгерд завершает строительство оборонительных укреплений в соответствии с новейшими требованиями фортификации, проникшими в ВКЛ с Западной Европы.

Строительство фортификационных укреплений проходило в два этапа: сначала возводился каменный оборонительный пояс, затем – дополнительные глинисто-земляные укрепления. Работы по сооружению укреплений были приостановлены лишь пожаром 1335 г., уничтожившим весь город.

Стены замка были сложены в технике “grand appereil» из валунного камня ледникового происхождения. Специфика кладки заключалось в том, что крупные валуны располагались по лицевому и



Репозиторий ВГУ